***Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навучальна-педагагічны комплекс Першамайскі дзіцячы сад – сярэдняя школа»***

# Рэспубліканская акцыя «Любим Беларусь, гордимся Беларусью, путешествуем по Беларуси»

## ***Намінацыя «Нам 41-ы не забыць… Нам 45-ы славіць»***

## ***Міні-інсталяцыя «Наш край у гады ваеннага ліхалецця»***

**аг. Першамайск 2019**



***Няма на Беларусі такога кутка, які б не стаў месцам здзяйснення народнага подзвігу. І няма месца, дзе не шанавалі б гэтыя подзвігі.***







На тэрыторыі Першамайскага сельскага савета ў верасні 1943 года з партызан 1-га і 3-га ўзводаў атрада імя Ленінскага Камсамола сфарміраваны атрад імя Катоўскага. Камандзірам атрада быў абраны **Еўдакімаў Іван Раманавіч** - «партызан Саша». У гэтага чалавека незвычайны лёс: турма, два лагеры, тры пабегі. Ён выжыў для таго , каб змагацца…









Судьбы людские
ПАРТИЗАН „САША"
Это рассказ о человеке необычной судьбы. Тюрьма, три лагеря, два побега — он выжил, чтобы бороться. 50 тысяч марок давали гитлеровцы за его голову.

# *Байцы партызанскага атрада – госці школы (1974 г.)*







# *Агародзішча – сястра Хатыні*

*(знаходкі з месца трагедыі)*









Пасля таго як спалілі вёску Агародзішча , фашысцкія карнікі на зваротным шляху завярнулі на лесапункт Казлішкі. Тут яны пасля сябе аставілі яшчэ 9 трупаў. Ад рук гітлераўскіх галаварэзаў загінула Таццяна Пашынская, якую фашысты насільна прымушалі працаваць на лесаўчастках.

Нарадзілася Таня 16 чэрвеня 1920 года. Пасля 8- ага класа яна паступіла ў тэхнікум лясной гаспадаркі пад Харкавам. Тут яна ўдзельнічала ў драмгуртку і танцавальным гуртку. Была вельмі актыўнай. Тэхнікум яна закончыла ў 1940 годзе. Таццяна да вайны працавала ў Парэчанскім леспрамгасе. Затым направілі ў горад Гродна, а з Гродна яна атрымала назначэнне на самую граніцу з Літвой і Польшчай ў Марцінконіс. Таню адразу назначылі лесатэхнікам, а затым ляснічым. І на гэта пасадзе Таня паказала сябе толькі з добрага боку. І вось прыйшлі немцы. Цэлы год маці не атрымлівала ад Тані пісем, потым сталі зрэдку прыходзіць. Спачатку Таня хавалася ў ляснікоў, затым голад пагнаў дзяўчыну на работу.

Была кухаркай ў нямецкіх пагранічнікаў, пасля даведалася, што калі будзе працаваць па спецыяльнасці, то можна будзе ўзяць перавод на работу на Украіну… Не усе пісьмы дайшлі, не ўсе захаваліся.

Больш года вучні нашай школы падтрымлівалі сувязь з Марыяй Сцяпанаўнай Пашынскай , з прыёмнай маці Тані. Марыя Сцяпанаўна Пашынская прыслала ў музей сшытка з перапісанымі Таніным пісьмамі, сшытак з лекцыямі па лясных машынах, фотаздымак сям’і.

*Няхай жа будзе нязгаснай памяць людская аб тых далёкіх гадах , аб  неўміручых подзвігах нашага беларускага народу з ворагам, каб наша сённяшняе жыццё было самым светлым, самым шчаслівым і багатым.*

